**Эдуард Акулін**

# НЕПРЫЧАЛЕНЫ ЧОВЕН

KAMUNIKAT.org

**Менск**
**2003**

**Эдуард Акулін**

Эдуард Акулін нарадзіўся ў 1963 годзе ў вёсцы Вялікія Нямкі, што на Веткаўшчыне. Скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт і асьпірантуру АН Беларусі. Працаваў настаўнікам, загадчыкам філіі Літмузея Максіма Багдановіча “Беларуская хатка”, намесьнікам галоўнага рэдактара часопіса “Першацвет”, загадчыкам аддзела паэзіі часопіса “Полымя”. Зараз – намесьнік галоўнага рэдактара часопіса “Дзеяслоў”, а таксама – намесьнік старшыні Саюза беларускіх пісьменьнікаў.

Аўтар кніг паэзіі: “Лес дзённага асвятлення” (1988), “Пяшчота ліўня” (1990), “Крыло анёла”, (1995), “Радно” (2000), драматычнай містэрыі “На Каляды ” (1996)Ю, двух песенных матнітальбомаў: “Мая Крывія” (1995), “Як яна і я” (2000) і кампактдыску “Напачатку была Песьня” (2003).

“Непрычалены човен”— новая кніга вершаў Эдуарда Акуліна. У ёй аўтар спрабуе знайсьці згублены бераг натхненьня, з болем азіраецца назад, дзе залітае “кінаварнай крывёю” ясьнееецца ў тумане ягонае страчанае паэтычнае “Радно”…

# ЗРЭБНАЕ РЭХА

***Рэквіем парэзанаму “Радну”***

*Хоць не калхідскае руно --*
*сатканае з суворых нітак --*
*Ад прадзедаў спакон -- Радно -*
*наш скарб духоўны і нажытак.*

*І гэты скарб на гвалт, на зьдзек*
*пусьцілі кніжныя вандалы.*
*О як пажадна рэзаў-сек*
*драпежны нож аб Волі мары...*

*Не ў кінавары , а ў крыві*
*лязо сталёвае кіпела...*
*На часткі -- поўную Любві*
*душу, што ў вершы заляцела.*

*На прах паперны ў небыцьцё --*
*Каханьне, Гонар, дух Максіма...*
*Дай Бог вам -- доўгае жыцьцё,*
*сьляпыя służкі Гільяціны!..*

**Што ёсьць Паэзія?**

Што ёсьць Паэзія? -- Жыцьцё,
ці думак прах на тле паперным?
Гасподні Голас, Адкрыцьцё,
ці д’яблаў смутак апраметны?

Што ёсьць паэзія? -- Ныцьцё
душы на паперці жыцьцёвай?
Ці дабіблейскае быцьцё --
перадусімнасьць сутвы Слова?

Што ёсць Паэзія? -- Зьліцьцё
Красы адвечнай і Паэта?
Ці ваўкалацкі лёс -- выцьцё
над перакуленым Сусьветам?

Што ёсьць Паэзія? Што ёсьць?

**Аве, Марыя**

*Памяці маці*

Час прыйшоў за грахі вініцца...
Памяць паліць гады на тло.
Ды часьцей стала мама сьніцца --
не сама, а яе Сьвятло.

Мне на гэта Сьвятло маліцца --
покуль будзе мой шлях відзён...
--Мама, імя тваё сьвяціцца --
хай ад сёньня -- да скону дзён.

Гэта ж ты мяне нарадзіла.
Што змагла -- то ў жыцьці дала...
Ты і ёсьць для мяне Радзіма.
Не прывыкну казаць -- была.

**Па Нёмане на плыце**

Чэрвень. Чэзлае сонца.
Цень ад вясла ў вадзе...
Шлях -- як жыцьцё бясконцы
па Нёмане на плыце.

Ад зьвіслага вуса Усы --
паўз Прыстаньку, дзе калісь
дзядзька Якуб беларусаў
вучыў, як патрэбна жыць...

-- Пад бел-чырван-белым сьцягам

куды плывяце, хлапцы?
-- З грэкаў плывем у варагі...
Напраўду? – Ай, малайцы!

**Пасьпець**

За справамі, хатнім клопатам
спрабуем схаваць душу
ад неба, і Бог ня ў попыце, --
як летняй парой кажух.

Зьбіраем, будуем, рупімся --
сьпяшаем кудысь пасьпець.
А чым за грахі адкупімся? --
з сабой не захопіш медзь...

Люстэрка па даўнім звычаі
схавае ад воч радня...
А што , як сябе бяскрылаю
убачыць у ім душа?..

**Патрэбны**

Ты камусьці патрэбны
на бацькоўскай зямлі,
дзе біблейскія вербы
зоры ў кроны ўплялі.

Дзе ў нябёсах высокіх --
жураўлінавы шлях,
дзе начуюць анёлы
на царкоўных крыжах.

Ты камусьці патрэбны.
Ты патрэбны камусь...
Покуль моліцца небу
за цябе Беларусь.

**Трыпціх Слова**

I

Слова -- мой шлях да Бога.
Слова -- мая дарога.
Слова -- мой крыж жыцьцёвы.
Бог уваскрэс у Слове.

Слова і ёсьць мне Богам --
небам, крыжом, дарогай...

II

Сьлёзы Хрыстовы -- словы.
Словы -- Хрыстова кроў.
Цьвікамі ў далонях словы --
Бог -- гэта Любоў...

III

Насеньне Слова ў ральлю душы
Бог шчыра сее -- не саграшы..
І ў думным жыце
урэшце рэшт
Бог дасьць - узыдзе
валошка-верш.

**Лебедзь**

Лебедзь -- у сінім небе.
Гэта прыйшла зіма.
Белай завеяй вецер
пух разадзьмуў з крыла...

І над цнатлівай Пціччу,
як багародны грэх,
лебедзь -- тваім аблічам
кружыць біблейскі сьнег.

**Клямка**

Клямка на брамцы дзяцінства майго --
так незаўважная плямка.
Як на марозе сарваная ў кроў
скура на вуснах ранка...

Клямка -- язык паказны дзьвярэй.
Клямка -- далонь падворка.
Звычніца клянчыць і чым старэй --
тым адмысловей горка.

Клямцы паклёпнічаць не з рукі.
Клямка сама з паклёпу...
Колькі разоў да яе замкі
слалі сватоў бяз толку.

Клямка у сенцы і пад павець.
Клямка ў чужое шчасьце...
Мара мужчыны -- хутчэй займець
клямку жаночай жарсьці...

**Вільчык**

Хто з нас скокнуць ня марыў з вільчыка
у дзяцінстве на пару з ветрам?..
Стуль, дзе певень стаяў за пільніка,
дзе хмяліла віном паветра.

Падагнаны скрылём да скрыльчыка,
з клёпак зьлеплены ехаў дах,
як па строме страхі да вільчыка
я ішоў, прыручыўшы страх.

Мудры час ўсьміхаўся ўмілена,

і крыло падстаўляў Анёл.
Мы расьлі і ніжэлі вільчыкі,
і радніўся з блакітам дол.

Хутка сын з вышыні акрыленай
свой зрабіць паспрабуе крок...
Божа літасны, не пакінь яго,
як Ікара, сярод аблок.

**Карчма**

Як віно бурдзюка мяхі --
разрываюць мяне грахі...

І душа, што была царквой,
мая стала цяпер -- карчмой.

А ў карчме ладзіць чорт імшу,
а ў карчме прадаюць душу.

Хто за срэбра, а хто за кроў,
хто Радзіму, а хто сяброў.

Нехта маці, а хтось жану,
нехта здраду, а хтось віну...

Бо няма у карчме ікон,
бо піўны у карчме амбон...

І сьвятар -- хітры чорт глухі --
адпускае віном грахі.

**Позна**

Марна анёл-ахоўнік
мне надарваў рукаў --
міма царквы праходжу,
часу няма на Храм.

А у вязьніцы-целе
стала душа старэць.
Б’ецца, як рыба ў пелі,
аб ледзяную цьвердзь.

Ды за бязьвер’я хмарай
сонца ёй не відно.
Позна аб крылах марыць --
цягнуць грахі на дно...

**Восень**

Восень. Дажджы. Слата.
На скразьняках Сусьвету
выстыў птушыны шлях --
душ пералётнасьветных.

Столькі у іх сьвятла,
столькі тугі крылатай...
Зорыцца Млечны шлях,
нібы царква, на сьвята.

**Стрыптыз**

У тэатры восеньскага лесу,
дзе няма ні сцэны, ні куліс,
вецер рэпетуе зранку п'есу
з мадэрновай назваю "Стрыптыз".

**Аднойчы**

Аднойчы мяне ня стане --
як рэха ў сьляпым тумане...
Спачатку забудуць суседзі,
пасьля сябры і калегі

KAMUNIKAT.org

і ў рэшце рэшт -- Каханая..

А дзеці? Няўжо і дзеці,
кім марыў я тут застацца,
таксама мяне забудуць
і не паклічуць з туману.

**Ношка**

Я нясу на плячах сваіх цемру...
Бацька -- мне, дзед -- яму перадаў.
Гэта цемра -- паўночнае неба,
і знутры -- залатая яна.

**У ракуцёўшчыне**

У родным краі ёсьць крыніца...
Чыймі сьлязьмі --
нам столькі год не наталіцца? --
скажы, Максім.

Валошкі ў жыце на пагорку
ня тояць страх.
Таму нябёсы -- лёсам горкім, --
хто горды Птах...

Хоць дух Паэтаў з кожным годам --
усё вышэй.
Ды пачуваць сябе Народам --
чамусь цяжэй...

**Слова**

Даруй мне, Слова,--
я страшны грэшнік,

што ганьбіў мову
бяздарным вершам.

Што сэнс твой боскі
не разгадаў я,
што здрадзіў Лёсу --
Табой ня стаў я.

Каб быць Паэтам --
жыць трэба Словам,
лунаць над сьветам
на крылах мовы.

Я ж не лунаю
у сінім небе,
бо крыл ня маю,
як Страцім-Лебедзь...

**Сыс**

Забылі Сыса -- як забілі
Паэта у мулкай труне...
Забілі, забілі, забылі --
"І словы - вярыгі мае..."

Забылі Сыса -- як любілі,
як вучні калісьці Хрыста.
Забілі, забілі, забылі --
"І выкрэсьліў Слова я..."

Забылі Сыса -- як малілі:
-- Ня пі болей, Толя, -- памрэш...
Забылі, забылі, забілі --
яго ненапісаны верш.

Забылі Сыса -- як завылі
апоўнач за Гомлем ваўкі.
Забілі, забілі, забылі --
чые між аблок ветракі...

**Плашчаніца**

*Барысу Пятровічу*

Мінуў той час, калі
сустрэўшы паміж ночы,
Анёл нам гаварыў:
-- Жывіце -- вочы ў вочы...

Гады, нібы плыты,
да плёса Лёс звалочыў,--
ды памяталі мы --
жыць трэба -- вочы ў вочы.

І ў вечнасьці на дне
праявіцца аднойчы,
як фрэска на радне --
два словы -- вочы ў вочы...

**Выбар**

*Раісе Баравіковай*

Такое кароткае лета...
Пасьпець бы прамовіць: -- Кахаю!
А лёс нарадзіцца Паэткай --
Галгофа ў юдавым краі.

І толькі з мінулых вякоў,
якія нам больш не належаць,
параненым крыкам -- дакор:
-- Каханьне альбо Незалежнасьць?

Альбо -- і нічога паміж,
і выбар амаль неадольны...
-- Каханьне... Каханьне -- мой крыж!
Хай іншыя выберуць Волю...

kamunikat.org

**Тут Зніч уваскрос...**

*Галіне Дзягілевай*

У лёхах касьцёла Сымона й Алены,
якім любаваўся калісьці Максім,
Драўляны алтар -- паэтычную сцэну --
ахутаў біблейскага вогнішча дым.

У дыме тым -- яблык надкушаны Евай,
і рэха літаньняў і шоргат крыла...
І песьні, ці лепей сказаць -- песьнясьпевы --
гучаць, як найвышняму Пану хвала.

Тут сьветла ад свечак - ды не з жырандоляў.
Тут сьветла ад сьвечак, што ў душах гараць...
Тут Зьніч уваскрос -- нашай марай аб Волі,
якой ні разьбіць, ні спыніць, ні стрымаць!

**Спакон**

Спакон у славянскім жыце
валтузіліся між сабой
Расія-імператрыца
і польскі галган-кароль.

Пры іх ад цямна да ранку
са сьвечкай на ўсіх вятрах
Радзіма мая -- сялянкай
стаяла у галавах...

**Датуль**

Датуль Беларусь ня згіне,
ня кане ў нябыце-сьне, --
пакуль у нябеснай сіні
заступніца-Ефрасіньня
моліцца за яе.

**Жыве!**

На парозе тысячагоддзяў,
не скароная ліхаўне,
у Храме -- сваім Народзе --
як спакон -- Беларусь жыве!

KAMUNIKAT.org

# ПЕРАКЛАДЫ

**З чужога неба**

***З літоўскай***

***Аідас Марчэнас***

**Паэт**

*Гінтантаўтасу Патацкасу*

мне крылы пазычыць вецер
анёл мне падорыць ліру
а слугі ўскладуць на плечы
мне золата ладан міру

прайду я патухнуць зоры
у пыл спарахнеюць замкі
абурана бура горы
зраўняе для хіжай славы

сьвятлом надзяліце й хлебам
грашыма і цёплым дахам
і вернецца наўзамен вам
крывёй і гарачым прахам

я хлушу найлепш ад праўды
нашмат прыгажэй чым трэба
я хлушу а гэта значыць
жыву і чакаю хлеба

каханак ад лішняй цноты
віно ад абрыдлай тары
я вызвалю нібы голас
схаваны ў душы гітары

kamunikat.org

*Стасіс Юнаўскас*

**Маляваў кветкі...**

Фарбы разбаўляючы зімой,
Пэндзаль акунаючы ў нябёсы,
На мальберце завадзі рачной
Маляваў ён кветкі з сумным лёсам.

Ім жыцьця ня хопіць адцьвісьці,
Як звычайным кветкам выпадае,
Бо нябёсы ў восеньскім лісьці,
І дажджамі хмары набухаюць.

Хоць да першасьнега – многа дзён,
Дзе ідзе ён – іней праступае.
У нябёсах воблакаў мільён –
Месцы неабжытыя займаюць.

*Ёнас Зданіс*

**Костка**

Дзень вісіць, як белая кашуля
на вяроўцы пад зімовым дубам.

У пакоі жанчынамі поўным
на пытаньні адны і тыя ж я стаміўся адказваць зноўку.
У сьвятле, як сусьвет скалелым, сьвецяць твары
іх перад дрэвам.

Трызьніш ты на народнай мове,
а, прачнуўшыся, пішаш *брат мой*
на сьцяне у сваім пакоі аскалабкам засохлым косткі.

Прыручаю паглядам рэчы:
абмялела каханьня рэчка – зморшчын рэчышча ля вачэй,
перасохлыя смагай вусны.

Тонкіх ліній крыштальны іней
зімніх літар, марозных слоў,
схаладзелых пад языком.

*Арнас Алішаускас*

**Сучаснасьць**

З пылінкі перліну гадуе час-факір
Як мусульманін страшыцца шайтана
Баюся гэтак сьмерці нечаканай
Калі нябёсы зносяцца да дзір
І Бог адтуль пакажа  босы німб
Раскрыліць дзьверы непадскрыпна брама

Я думаў што спасьцігнуў тайну слоў
Адкуль бяруцца знакі пакрыёма
Чаму люстэрка родніцца з радном
Калі жалоба абжывае раптам дом
А сёньня я чакаю двух сыноў
Хто д’ябал, хто анёл з іх невядома

Пакуль на сподзе сьпее глінны хлеб
Пакуль праклён не збыўся аніводзін
Зноў бацьку мыліцы прысьняцца заміж крыл
Тастамантам няспраўджаных магіл
Сканае з рыкам д’ябал ува мне
Не абвясьціўшы богавых народзін

* * *

Я сьведчу што нічога больш няма
Ня згадана ня спраўджана забыта
Страх старасьці – нязжытая зіма
Бо толькі ў снах цьвіце зімою ліпа

Паўторыцца нанова сумны сон
Гандлююць газай брудныя бабулі
Ня ў першы раз страх возьме у палон
Сад дыяментавы і ты ў начной кашулі

Яшчэ блукае й нараджаецца агонь
То б’ецца птушкай то паўзе змяёю
Тым днём калі цьвікі ня скрозь далонь
Скрозь хлеб прайшлі запёкшыся крывёю

Дзе пір агню там правілаў няма
Ні сьмерцяў толькі лічбы з нумарамі
Калі ты хворы значыць хворы я
Кастром шаманскім сонца па-над намі

Пад вечар ані слоў ані гасьцей
Застылі гіры ў змове з ланцугамі
Над горадам кружляе белы сьнег
Як позьні птах над чорнымі стагамі

*Генрыкас Альгіс*
*Чыгрэюс*

**Вецер у дрэвах прымор'я**

Той вецер у дрэвах такі нянаскі,
З Балтыі ён, а магчыма й па Швецыі швэндаў,
Такі заходні, такі сусьветны,
Гул ягоны – знаёмай песьняй.

А можа ён з поўначы,
З Салачаю, з Біржайскага краю
Швагерчык; поначы
Самім сабою прыгнаны.

Злуецца вецер, дык гайда за стол,
Ды без бутэлькі нельга!
Бяз чарачкі падобным стане ён
На замак, што ня мае вежаў,
Твой стол-бянтэжнік.

* * *

Прафесар жлукціць з пляшкі піва
Ля кірмашу; я падыходжу
Вітаюся, гляджу яму у вочы,
Ён дзеліцца глытком са мной, шчасьлівы.

А час такі – да восені бліжэй,

Чым да аблок, што ў небе валунамі –
Бухматай воўны поўнымі вазамі
Плывуць, як на распродаж, без надзей.

Гляджу на іх – здароўем небагаты,
А ў галаве – асеньні ліс тапад,
Кружляе лісьце, танчыць неўпапад,
Нібы з чужога прыляцела саду.

***З украінскай***

***Раман Лубкіўскі***

**Паляваньне**

І доўжыцца спрадвеку паляваньне,
За рацьцю раць стральцоў па сьледзе йдзе,
То хітры зьвер ад вечара да раньня
Іх на нябачным повадзе вядзе.

Ідуць стральцы. Згубіліся дарогі.
Зьбялела сонца ў небе, нібы косьць.
Ім мроіцца алень блакітнарогі,
І аксамітна-вогненная поўсьць.

Тут столькі стрэлаў страчана дарэмна,
Тут столькі лукаў зломлена тугіх…
Вастрэй стралы -- тут вока мець патрэбна.
Вастрэй за нож – тут мець патрэбна слых.

…Сяджу ў засадзе, сэрцам заміраю,
Як росны ліст ад холаду трымчу,
Стралу выцягваю і гэтак закладаю,
Каб нават вецер шолах не пачуў.

Такімі вось блакітнымі начамі,
У сэрца зазіраючы сваё,
Я бачыў зьвера з сінімі вачамі,
Што піў з крыніцы зорнае сьвятло.

І высьпеў стрэл. Глядзі, не прамахніся,

Сястра мая, страла, не падвядзі!
Ляціць страла, нанізваючы лісьце,
Ляціць страла, зьбіваючы гады…

А я стаю адзін у звонкай цішы,
Чакаю ўпарта сьнег на галаву…
Ды не стралу, а сэрца насадзіўшы,
Нацягваю тугую цеціву…

*Алеся Мамчыч*

**Журба**

Журба як птах
Гадуе птушанят
Малых рахманакрылых
журбянят.

Каб ціхі рэй –
каб іх – крылаты рэй
асеньнім лісьцем
падаў з чорных вей.
Каб у калюжах
Крылы іх спляліся…

Журба як птах
адлётвае калісьці.

***
Я па пяты ў расе
І па сэрца ў расе
І ня знае ніхто,
Што пабачылі ўсе

І ня знае ніхто --
Толькі сьвет патойбоч,
Як сьпявала наўзрыд
Скрывянелая ноч.

KAMUNIKAT.org

Як сьпявала наўзрыд,
І як месяц асьлеп,
І як потым дажджы
Разарвалі сусьвет.

І як падаў сусьвет
Цяжкакрыла між траў,
Пахрысьціўшы мяне
На сьвітанку – як храм.

*Ліна Кастэнка*

**Ван-Гог**

Добрай раніцы, адзінота!
Холад холаду. Цішы ціш.
Цыклапічнасьцю аднавокай
неба дзівіцца на Парыж.
Мая мука, ты ходзіш па лёзах!
Яшчэ ўчора я быў каралём.
А сягоньня попел бялёсы
асядае на жоўты дом.
Зьмерлі барвы.
О рукі-хмары!
На мальбертах расьпяты сьвет.
Я – жалобны камень цьвінтарны.
Кіпарысавы хвост камет.
Неба ў негадзь, бы ноч, глухое.
Гнуцца пэндзлі, як чараты.
Чорным рэхам палеазою
паламаныя гор хрыбты.
Прамяніцца маё скляпеньне.
Я пастух. Я сад стары пасу.
Ў кішэнях дня,
залапленых цярпеннем,
я кулакі да сьмерці данясу.
Самавіты – несамавіты –
не Сезан – не Гаген – не Манэ –
але што ж я магу зрабіці,
як мяне багата ў мяне?!
Ён бажавольны, кажуць. Бажавольны!

Магчыма й так. Ён – гэта значыць я.
Божа – вольны…
Божа, я – вольны!
Дык дабранач, Свабода мая!

* * *

Зіхціць між ружаў золатам калыска.
Блакіт павекаў хата узьняла.
Сьвет неаглядны здалечы і зблізку.
Пачатак ёсьць. А слова шчэ няма.
Шчэ дзіўны дым і хаты выгляд новы,
І шчэ ніяк нічога не завуць.
І хмары , не прывязаны да слова,
А проста так – плывуць сабе й плывуць.
Шчэ кожны пальчык сам сабе Бетховен.
Шчэ ўся мая на сьвеце прыгажосьць.
І сьвеціць сонца вокам каляровым.
Шчэ слоў няма. Паэзія ўжо ёсьць.

* * *

Баюся слоў, калі яны маўчаць,
калі яны дыханьне затаілі,
калі ня знаеш, як табе пачаць,
бо словы ўсе былі ўжо чыімісь.

Хтось імі плакаў , кленчыў да багоў,
з іх пачынаў і зьнік за небакраем.
Людзей мільярды і мільярды слоў,
а ты упершыню іх вымаўляеш.

Усё паўторыцца:краса і шматкалёрнасьць.
Усё было: асфальт і спарышы.
Паэзія ж – заўсёды непаўторнасьць,
як бесьсямяротны дотык да душы.

* * *

Прадвесьне засьмяялася: -- Пара! –
за Чорным Шляхам, за Вялікім Лугам –
гляджу: мой прадзед, і пра-пра, пра-пра –
ідуць за часам, як за плугам.

Губляецца бясконцы караван,
за Чорным Шляхам, за Вялікім лугам,
яны ужо ў тумане – як туман –
усе ўжо йдуць за часам, як за плугам.

Як вол стамлёны, вечнасьць ледзь ступае! –
за Чорным Шляхам, за Вялікім лугам.
Свавольная, як вецер, маладая –
няўжо і я іду ўжо, як за плугам!?

І што ўзару? Засею чым майдан?
за Чорным Шляхам, за Вялікім Лугам.
Няўжо і я ў тумане – як туман –
І ўсё ж іду за часам, як за плугам?..

* * *

Зноў тое самае
ізноўку за сваё
стаміўся дух лунаць
між хмар крылата
ня ведаю
Хрыстос
мо дзе і ёсьць
куды ж ня глянь – паўсюль адны Пілаты.

# ПОКУЛЬ ЛЯЦІМ…

## Сьпяшайма жыць!

*Міхасю Скоблу*

Па дарозе з Гомеля на Менск
у лісьцёвым залатым тунэлі
хуткасьць набывае новы сэнс,
нібы штрых на сьвежай акварэлі.

Восень, што скалела ад вятроў,
восень, што азябла ад туманаў,
просіцца ў нагрэтае аўто,
нібы прыдарожная путанна...

Восень пашкадуем -- так і быць,
бо і самі сёньня -- пілігрымы.
Між аблок стралой анёл ляціць,--
ледзьве пасьпявае за машынай…

## Мова

Выплачу вочы ў снах.
Высушу крыўдай сьлёзы.
Мова мая -- сасна
паміж Нямкамі й Гомлем.

Прыйдзе паэт-юнак
і без якой прычыны
з сэрца яе няўзнак
стане шчапаць лучыну.

Потым сівы скрыпач
скрыпку з душы дастане,
ды заіграе так --
вусьцішна ў сьвеце стане.

KAMUNIKAT.org

Ну а сьляпы сьвятар
сьвечку з крыві - жывіцы
ставіцьме на алтар,
каб на сьвятло маліцца.

Як пералётны птах,
шлях на Радзіму помню,--
покуль шуміць сасна
паміж Нямкамі й Гомлем.

**Прарок**

Ці быў прарок
у тых, каго няма...
Калі і быў--
даўно пасьпеў зьнябыцца.

Бажок тутэйшы
з зорнага сяйва,
нібы з латка,
гандлюе Мілавіцай.

Няма Народа
і мяне няма...

Над пляцам Волі
ў свастыку з сярпа
спрабуе маладзік
перарадзіцца.

**Прыцягненьне**

Я -- серабро. Ты -- золата. Павек
не паяднаць нам нашыя стыхіі.
Як срэбра Беларусі -- сьлёзы рэк
з крывёй чачэнскай -- золатам Расіі.

Я -- серабро. Ты -- золата. Наноў

не пераплавіць лёсаў нам ніколі.
Мой срэбны боль -- з імперскіх кайданоў,
твой -- залаты, ён выкаваны з Волі.

Я -- серабро. Ты -- золата. Чаму ж
між намі незямное прыцягненьне...
Такое -- як кахае жонку муж,
бы месяц сонца -- да жыцьцязацьменьня.

**Азаімія**

Прылягуць вятры
між азяблых аблок,
а за імі й я прылягу...
*Азаімія* --
заінелы радок,
што з завейнага вынік ранку.

*Азаімія* --
сноў зазіміны.
*Азаімія* --
сьнегасьпеў.
*Азаімія* --
даль задымлена
і зазімлена неўспадзеў.

Прачнуцца вятры
і зьдзівяцца,
а за імі й я -- усьлед.
*Азаімія* --
песьня зімняя,
мной прыдуманы вершасьвет.

**Нанач**

Прыкшчуся нанач
да шэптам вымаўленага
слова Радзіма,

што ў Бога вымалена...
Што ў злачасіну
было затулена --
крылом Страціма,
душой матулінай.

**Жыцьцё і Сьмерць**

Сьмерць за Жыцьцём штодзень
блукае неадступна, --
як надакучны цень,
як неадольны смутак.

Жыцьцё на Сьмерць глядзець
стамілася ў маркоце...
Жыцьцё -- мацней за Сьмерць,
І Сьмерць за гэта помсьціць.

**Дзьве душы**

Мне прысьніліся сягоньня дзьве душы.
Дзьве душы было ў маёй матулі...
У тагасьветнай вусьцішнай ціш ы
дзьве душы перабіралі бульбу.

-- Мама, -- да старэйшай падышоў
і пацалаваў яе у скрусе.
--Як жа позна я цябе знайшоў,
колькі ж цябе плакаць я прымусіў...

-- Мама маладая, не крыўдуй,
што старую маму абдымаю,--
мне так сіратліва аднаму
на самотным беразе адчаю...

Мне прысьніліся сягоньня дзьве душы,
дзьве душы маёй матулі роднай...
Перабранай бульбы -- два кашы,
а на яве мамы -- аніводнай.

**Настрой**

Колькі велічы ў слове Радзіма!
Колькі гонару ў слове Род!
Як жабрак, што асьлеп вачыма,
прыблукаю у свой народ.

Пілігрымам, прыблудным сынам
узыду на сьвяты парог,
і нарэшце вярыгі скіну
і з душы, і з бадзяжных ног.

**Закахацца**

Закахацца, як -- у пятнаццаць,
не зважаючы на узрост!
І да раніцы цалавацца,
з салаўём разьдзяліўшы плёс.

Закахацца, бы ў неба ўзьняцца,
Млечным шляхам блукаць між зор.
І да раніцы абдымацца,
як з натуршчыцай Сальвадор…

Закахацца, як у юнацтве,
я наўрад ці ўжо змагу...
Бо каханьне лічу за працу,
а калісьці лічыў за цуд!

**Нічога**

Паміж намі нічога няма.
Ні каханьня, ні здрады -- нічога.
І завея -- як цень ад крыла
херувіма -- пасланьніка Бога.

Ён у нашыя сны заляцеў
і прымусіў паверыць дазваньня,

што як хваля на ціхай вадзе,
узьнікае з нічога Каханьне.

**Здрада**

Вясновы настрой --яснасловы.
Знаёмку ў кавярні сустрэў...
І нейкі матыў выпадковы
у сэрца няўзнак заляцеў.

Лілися, як музыка, словы,
ды вось жа знаёмку сустрэў,
і стала падобным на ловы
жыцьцё з пачуцьцём напавер.

На ноце узьнёсла-фальшывай
загнаная ў пастку душа
спаймала сябе і зламіла
у сэрцы стралу ледзяша... .

**Жарсьць**

Мой грэх сьмяротны -- гэта ты.
Я так кахаў цябе аддана --
да першароднай ясна ты
на дне сьвітальнага тумана.

Мой грэх сьмяротны -- гэта ты.
Я так хацеў цябе бязбожна,--
як хоча грэшніцу сьвяты
сьхіліць на праведнае ложа...

**Жанчына**

Жанчына -- сасуд бяз дна...
Дакладней -- Сусьвет сусьветаў.

KAMUNIKAT.org

Сам Бог у яго віна
наліў, каб натхняць паэтаў.

Заблудзяцца ночы ў днях
у пошуках апахмелкі...
Жанчына -- сасуд бяз дна
для тых , хто душой нямелкі.

Камусьці -- фрагмент рабра,
узноўлены клон Адама…
А мне -- акіян сьвятла --
Каханая, Муза, Мама.

**Рай**

Райскае дрэва
вецер гайдаў…
Ты -- мая Ева.
Я -- твой Адам.

Хто нас спакусіў --
цяжка сказаць.
Зьмей нам ня схлусіў --
шчасьце кахаць.

**Каханьне**

*Натальлі*

Сем тысяч начэй -
я спаў ля тваіх вачэй.

Сем тысяч начэй -
я дыхаў тваім дыханьнем.

Сем тысяч начэй -
нам месяц сьвяціў ярчэй…

Сем тысяч начэй -
Каханьня.

KAMUNIKAT.org

**Не аддам…**

Чужога шчасьця мне ня трэба.
З мяне хапае і свайго…
Ў тваіх вачах начуе неба,
а ў небе тым гасьцюе Бог.

Каханьня Бог у родным небе,
Ён лучыць нас на зло гад*а*м.
Чужога шчасьця мне ня трэба,
але й свайго я не аддам!..

**Матылёк**

Твая душа - як матылёк, --
трымціць у сне перадсьвітальным.
Баюся дыхаць - каб пылок
не зьдзьмуць з павекаў -
крыл астральных...

**Бессань**

Нібы прарвала высі --
ноч барабаніць дождж.
Бессань душу капрызіць.
Гострыць самота нож...

Ды беспрытульны вецер
форткі зьвініць крылом --
згадкаю, што ў Сусьвеце
ёсьць твой сапраўдны дом.

**Прадвесьне**

Калі адчую, што высьпеў вецер
у весьнім небе для першагрома, --

KAMUNIKAT.org

зноў заначую з Каханай-песьняй
і прытулюся душой да Слова.

І сон з пакоя зьбяжыць упрочкі,
і будуць зябка аб шыбу біцца
радкі-падлёткі насупраць ночы,
каб ранкам вершам у высі ўзьвіцца!

**Натхненьне**

Як цеціва, страла і лук,
як з ноты вызвалены гук,
як палімпсеста тайнадрук,
як варажба цыганскіх рук,
як аральля і гостры плуг,
як жырандоля і жаўрук --
Натхненьне.

**Класіка**

--*Мой родны ліфт, як ты мне мілы...*--
шапчу, вярнуўшыся з дарог.
Паэтам дадзеныя крылы,
іх выбірае з лепшых Бог.

У неба месячных падстрэшках,
як вераб'і, анёлы сьпяць...
Пакуль паэты пішуць вершы --
паэтам дадзена лятаць!

**Сон**

Хлопчык, што бяжыць па вадзе,
часта ў снах зьяўляецца мне.

Не ўсьвядомлю ў сьне я ніяк --

як ён гэта робіць, дзівак.

Пырскамі вясёлкавы дым
вырастае сьледам за ім.

І куды ён столькі гадоў
па рацэ бяжыць маіх сноў?..

**Покуль ляцім…**

*І.І. Думанскай*

Хтосьці вып 'е з нас келіх поўны,
хтось -- палову, як дасьць Гасподзь...
Пад нябёсаузьнёслым Словам
не жагнаюцца мімаходзь.

Тое Слова было ў Максіма --
як заклён, як сьвяты зарок.
Каб мы ў сэрцах сваіх насілі,
бы ружанец -- яго "Вянок".

Каб забылі пра звадкі-спрэчкі,
а пагляды зьліліся ў сінь,
дзе Страцім вартавацьме вечнасьць,--
покуль мы да яго ляцім…

**Непрычалены човен**

Ліс, што мкнецца па сьледзе.
Кроў, што б'ецца у скронь.
Непрыручаны вецер.
Нехрышчоны агонь.

Поўні жоўтая сьвечка.
Дух заюшаны ў комін.
Незавершаны вечар.
Непрычалены човен.

**Дом**

З яснага неба гром –
позьняе адкрыцьцё:
Мама – мой першы дом,
хлеб мой, вада, жыцьцё.

Колькі пасьля было
розных кутоў, хацін, --
толькі – найродны той –
матчын – з усіх адзін.

Сэрца спаліў крыжом,
ды адмаліць ня змог…
Маму – мой першы дом --
сёньня пільнуе Бог.

**Турма**

А труна -- для душы турма...
А яшчэ ёсьць -- труна-Айчына.
Для народа свайго -- турма,
калектыўная дамавіна.

Пачарнела душа, як ноч,
ёсьць на тое ў душы прычына --
за сьлязамі ня стала воч,
каб глядзець на труну-Айчыну.

А ў турме не жыцьцё -- рэжым.
А ў труне не быцьцё -- гніеньне.
А ў душы -- пачарнелы дым,
а ў народа ў грудзёх -- каменьне...

Не Анёл уструбіў у рог, --
уструбіла у рог Сумненьне:
а ці ёсьць у нябёсах Бог? --
Бог-суддзя -- ад турмы збавеньне...

kamunikat.org

**Асеньняе**

У вырай буслы чарадою
па небе адвечным плывуць.
Зноў восень стралой залатою
спрабуе мне сэрца пратнуць...

Паходнямі -- клёны на ўзгорках
губляюць сьвятлынь у траву...
І радасна сэрцу і горка,
і крыху балюча яму.

**Пакрыёма**

Выхаплю сон з небыцьця
і з асалодай нязнанай
вуду старую жыцьця
стану надточваць падманам...

Каб пакрыёма злавіць
тое, што ў яве ня стрэціў:
сорам -- распусна любіць,
шчасьце -- бяз страху памерці.

**Словы**

З высокай цалі
мне словы ўпалі:
"*Нябёсы -- Радзіма ветру*"...
Пакуль нізаў я радка каралі,--
скразьняк зварухнуў паветра...

З сусьветнай далі
мне словы слалі:
"*Нябёсы -- Радзіма птушак*"...
Пакуль нізаў я радка каралі,--
з'явілася рыфма -- *суша*.

KAMUNIKAT.org

Пакуль вы спалі, --
мне словы далі:
“*Нябёсы -- Радзіма душаў*”...

**Анёл-Страцім**

Мне прысьніўся Максім Багдановіч --
беларускі Анёл-Страцім
у біблейскім вянку цярновым,
у пражылках густых крыві...

Мовіў ён, і паўночны вецер
яго словы між хмар разьнёс:
--Ні на тым , ні на гэтым сьвеце
не лічыце валошак-сьлёз,

не чытайце чужыя пісьмы,
*не давайце сьвятыні псам*...
І растаў у нябеснай высі,
там, дзе зьніклі сьляды Хрыста.

**Як вярнуць?..**

Я забыў, як маліцца Слову…
Для паэта ж маўчаньне – грэх.
І Гасподзь над душой ахову
адазваў да нябесных стрэх.

І зрабіўся мне сьвет нямілым,
нібы д’яблу прадаў душу.
Прамяняў на машыну – крылы,
Млечны шлях – на зьмяю-шашу.

Як успомніць з малітвы словы?
Як набыць адабраны рай?
Як вярнуць над душой ахову,
крылам – згублены небакрай?..

KAMUNIKAT.org

**Балада пра Чорнае ляда**

На чорнае ляда ня ходзяць касцы,
няма тут птушыных гнёздаў.
Праклятае месца за тры вярсты
дарогі вакол абходзяць...

Балота, як вока, сярод яго
з чорнай, як ноч, вадою.
Калі апусьціць у ваду багор --
багор, як тапор, патоне.

Калісьці, казалі, тут жыў бірук --
вядун, чарнакніжнік Посах.
Глядзеў, бы ў люстэрка, вядун у ваду --
прадказваць умеў лёсы.

Умеў замаўляць і ўмеў намаўляць...
Умеў, як казаў нехта, --
над чорнай дрыгвою пад поўняй блукаць --
хадзіць па вадзе пехам.

Такая за Посахам слава йшла,
а ён не любіў славы.
Ручнога у хаце трымаў вужа,
што ў поўні любіў плаваць...

Аднойчы да Посаха князь малады
прыехаў з сябрынай п'янай.
--Ты, Посах?
--Так.
--Уладар вады?
Прайдзі пасярод багны!

--Прайду, калі князь не збаіцца сам
за мною пайсьці сьледам.
І крок зрабіў, і на хвалю стаў --
патух пад нагой ветах...

Ні князя, ні хмельных сяброў яго
з той ночы ніхто ня бачыў,
і Посах зьнік -- як у вір багор, --

kamunikat.org

стаў Духам вады няйначай.

За часам і хата ў дрыгву ўрасла --
тырчыць з-пад імха комін...
Ды зрэдзь на вадзе залатога вужа
паблытае хтось з поўняй.

**Балада сустрэчы з Купалам**

А хто там ідзе?
*Янка Купала*

Па лістоце апалай
дождж сьляпы церусіў.
Я прыйшоў да Купалы --
дараваньня прасіць.

Дараваньня за тое,
што дагэтуль адказ
на пытаньне сьвятое --
рытарычны аванс.

Бо няма Беларусаў --
колькі іх не шукай,
тых, хто пойдзе хаўрусам
бараніць родны Край

ад ганебнага змусу,
ад чужога ярма...
Нас няма, беларусы!
Не было і няма!

У правалінах твару,
там, дзе вочы цьвілі, --
спахмурнелыя хмары
задуменна плылі.

Воч ня стала ў Купалы
ці ня хоча глядзець
на нашчадкаў-вандалаў --

тых, хто сёньня ідзе...

Па лістоце апалай
дождж асьлеплы блукаў...
Я прыйшоў да Купалы --
ён мяне не чакаў.

**Балада праклёну**

“Каб ты спрах без радзіны!” --
гэткі страшны праклён --
для прадаўцаў Радзімы,
для іуд-халуёў...

Прадаюцца заводы, --
ўсё, што льецца і п’ецца...
Памяць, Воля народа --
не прадаецца.

Трактары, самаходы, --
ўсё, што б’ецца і гнецца.
Песня, Мова народа --
не прадаецца.

Дрэвы рознай пароды, --
ўсё, што косіцца, жнецца.
Гонар, Годнасць народа --
не прадаецца.

Купяць нават Чарнобыль --
знойдуць чым заплаціць...
Сьлёзы, гора народа --
не прадаць, не купіць.

Не спрабуй -- не здалееш,
як мазгі не кукож, --
цэньнік свой не наклееш
на Дняпро і на Сож.

На крыжы нашай веры,

KAMUNIKAT.org

што ў глыбінях нябёс, --
не прычэпіш паперу --
“Прадаецца пад знос...”

Як з Бажніцы -- ікону,
як з магілы -- труну, --
так табе без праклёну --
не прадаць Беларусь...

Сам запомні і сыну, --
каб ня стаў халуём --
“Каб ты спрах без Радзімы!” --
перадай мой праклён.

**Балада пра Краіну-мару**

Мы, беларусы, – заўжды гатовы
снапамі класьці свае галовы.
Было спакон так і гэтак будзе --
такі народ мы, такія людзі.

Наш час спыніўся між дзьвюх Нямігаў,
дзе кроў ісёньня стаіць па грудзі...
Мы, беларусы, народ ад ліха,
ад Бога -- толькі сьвятыя людзі.

Яны былі ў нас, былі і будуць --
Рагнеда, Янка, Максім, Ларыса...
Мы, беларусы, – народ аблудлы --
сваёй радзінай не ганарымся.

У нашых душах гуляе вецер...
Каму мы служым? Чые мы дзеці?
На храмах нашых маўчаць званіцы.
Нямая вера -- як нам маліцца?

Як даравањня прасіць у Бога,
каб Ён вярнуў нам сябе самога.
Хрыстос калісьці хадзіў між намі...
Мы, беларусы, – Яго прагналі.

З нас, беларусаў, яшчэ спытаюць --
за лёс Страціма, за сімвал Краю.
Чаму у сэрцы з такім адчаем
нас б'е Пагоня -- сячэ мячамі...

Мо Беларусы, мы -- янычары?

Чацьвёрты кожны з нас стаў зямлёю...
Чарнобыль чыніць над намі кару,
Мы, беларусы, сваёй крывёю
сабе здабудзем Краіну-мару.

Краіну-мару, дзе мы ўваскрэсьнем --
як сонца з хмары, як мова -- з песьні.
Краіну-мару сабе здабудзем
мы, Беларусы. Мы -- ёсьць! Мы -- будзем!

**Заміж эпітафіі**

Калі памру,
сябры наўсьлед спытаюць:
-- Куды, паэце, крочыцьмеш у скрусе?
-- І рад бы ў рай – анёлы не пускаюць.
Мілей, чым рай – мне пекла Беларусі.

KAMUNIKAT.org

**Зьмест**

**Зрэбнае рэха**

Рэквіем парэзанаму "Радну"
Што ёсьць Паэзія?..
Аве, Марыя
Па Нёмане на плыце
Пасьпець
Патрэбны
Трыпціх Слова
Лебедзь
Клямка
Вільчык
Карчма
Позна
Восень
Срыптыз
Аднойчы
Ношка
У Ракуцёўшчыне
Слова
Сыс
Плашчаніца
Выбар
Тут Зьніч уваскрос!..
Спакон
Датуль
Жыве!

**З чужога неба**
(*Пераклады*)

*З літоўскай*
Паэт (Аідас Марчэнас)
Маляваў кветкі...(Стасіс Іонаускас)
Костка (Ёнас Зданіс)
Сучаснасьць (Арнас Алішаускас)
* * *Я сьведчу што нічога больш няма (Арнас Алішаускас)
Вецер у дрэвах прымор’я (Генрыкас Альгіс Чыгрэюс)
* * *Прафесар жлукціць з пляшкі піва (Генрыкас Альгіс Чыгрэюс)
*З украінскай*

KAMUNIKAT.org

Паляваньне (Раман Лубкіўскі)
Журба (Алеся Мамчыч)
* * *Я па пяты ў расе (Алеся Мамчыч)
Ван-Гог (Ліна Кастэнка)
* * *Зіхціць між ружаў золатам калыска (Ліна Кастэнка)
* * *Баюся слоў, калі яны маўчаць…(Ліна Кастэнка)
* * *Прадвесьне засьмяялася: -- Пара! (Ліна Кастэнка)
* * *Зноў тое самае (Ліна Кастэнка)

**Покуль ляцім…**

Сьпяшайма жыць!
Мова
Прарок
Прыщягненьне
Азаімія
Нанач
Жыцьцё і Сьмерць
Дзьве душы
Настрой
Закахацца…
Нічога
Здрада
Грэх
Жарсьць
Жанчына
Рай
Каханьне
Не аддам…
Матылёк
Бессань
Прадвесьне
Натхненьне
Класіка
Сон
Покуль ляцім…
Непрычалены човен
Дом
Турма
Асеньняе
Пакрыёма

KAMUNIKAT.org

Словы
Анёл-Страцім
Як вярнуць?..
Балада пра Чорнае ляда
Балада сустрэчы з Купалам
Балада праклёну
Балада пра Краіну-мару
Замест эпітафіі

KAMUNIKAT.org